Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 110 (27968) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## УПІСАЦЬ СВАЁ ІМЯ Ў ЛЕТАПІС СПОРТУ

*Удзельнікам I Еўрапейскіх гульняў у г. Баку (Азербайджанская Рэспубліка)*

**Дарагія сябры!**

*Разам з усімі прыхільнікамі спорту мы чакаем унікальнага відовішча — першых Еўрапейскіх гульняў.*

*Беларусь была адной з тых дзяржаў, якія падтрымалі ідэю правядзення гэтага маштабнага форуму Старога Свету. Менавіта ў Мінску ў 2011 годзе на пасяджэнні Выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў адбылося абмеркаванне праекта, а ўжо ў 2012 годзе ён быў зацверджаны на Генасамблеі ЕАК.*

*Таму з'яўленне нашай дэлегацыі пад дзяржаўным сцягам Беларусі на алімпійскім стадыёне ў гасцінным азербайджанскім Баку стане для нас урачыстай і вельмі прыемнай падзеяй. Упершыню ў гісторыі будуць разыграны медалі Еўрапейскіх гульняў, і кожны ўдзельнік спаборніцтваў упіша сваё імя ў летапіс спорту. Шчыра спадзяюся, што для нашай каманды гэта будуць слаўныя старонкі.*

*Жадаю вам з годнасцю прадставіць Беларусь на першых Еўрапейскіх гульнях у Баку.*

*Поспехаў вам і яркіх перамог!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь,**
**Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

* * *

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Азербайджанскую Рэспубліку. Учора кіраўнік дзяржавы прыняў удзел у афіцыйнай цырымоніі адкрыцця I Еўрапейскіх гульняў. Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі правядзе шэраг двухбаковых сустрэч і наведае спартыўныя аб'екты ў Баку.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім КАРМАЗІН, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Парадак налічэння падаткаў у сферы аграэкатурызму будзе перагледжаны, цяпер вядзецца работа над змяненнямі ў заканадаўстве. Мы выпрацоўваем прымальную схему, яна абмяркоўваецца з суб'ектамі аграэкатурызму. Падатковыя стаўкі павінны быць дыферэнцыяваны, павінна выконвацца прапарцыянальнасць памеру падаткаў і аб'ёму аказаных паслуг. Стаўка вырасце, але будзе ўлічаны фактычна адпрацаваны час. Адпрацаваў тры месяцы — заплаці пэўны падатак за тры месяцы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15336,00 | ▼ |
| Еўра | 17262,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 280,96 | ▼ |
| Укр. грыўня | 728,90 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

15110

# У Надзеі на Палявой



*Так называецца аграсядзіба ў Быхаве, якую стварыла былая школьная настаўніца беларускай мовы і літаратуры Надзея Матусевіч. Надзеі Рыгораўне дапамагае муж Іван — таксама пенсіянер, а яшчэ, падчас летняга адпачынку, унучка Даша. На ўскраіну горада, на вуліцу Палявую, дзе месціцца аграсядзіба, прыязджаюць госці не толькі з нашай краіны, але і з Расіі.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

# У ЛІПЕНІ ПРЫПЯЧЭ НАПОЎНІЦУ

## Сярэдняя тэмпература трох месяцаў лета будзе вышэйшай за кліматычную норму (плюс 16,8 градуса), а на выхадныя чакаем да плюс 34

**Пра гэта расказаў <u>начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Дзмітрый РАБАЎ</u>.**

### ВЫПРАБАВАННЕ НА СТАРЦЕ

Кліматычнае лета сёлета ў нашай краіне наступіла дакладна ў тэрмін. У асобных раёнах нават крыху раней — ужо ў другой палове мая, калі сярэднясутачная тэмпература пераскочыла плюс 14 градусаў. А потым з 1 па 10 чэрвеня сярэдняя тэмпература паветра стала на 1-4 градусы вышэй за кліматычную норму. Асабліва з першых дзён чэрвеньскую спякоту заўважылі жыхары паўднёвых рэгіёнаў, дзе максімальная тэмпература паветра дасягала 30-31 градуса.

### ТЭМПЕРАТУРА — ПЛЮС, АПАДКІ — МІНУС

Начальнік службы адзначыў, што істотным мінусам такога пачатку лета з'яўляецца недабор ападкаў. У большасці раёнаў краіны ўвогуле не было дажджоў. Такі сухі пачатак лета ў Віцебскай вобласці бывае раз на 20 гадоў, у Магілёўскай — раз на 25 гадоў, а ў Мінску — раз на 35 гадоў. Таму ўжо ў чацвер спецыялісты Гідраметцэнтра амаль паўсюдна па краіне вызначаюць высокую пажарную небяспеку (4 клас), а ў асобных раёнах Гомельскай вобласці зафіксаваны надзвычайны 5 клас. З улікам таго, што ў найбліжэйшыя дні тэмпература паветра будзе павялічвацца, а істотных ападкаў не чакаецца, то ў большасці паўднёвых раёнаў ўсталюецца 5 клас пажаранебяспекі, упэўнены спецыяліст. Асобна ён нагадаў пра асцярожнасць з агнём у лесе, дзе хопіць адной памылкі, каб разгарэўся страшны пажар.

### РЭКАМ НЕ ХАПАЕ ВАДЫ

Сёння на рэках краіны адбываецца спад узроўняў вады з інтэнсіўнасцю 1-10 сантыметраў за суткі.

СТАР. 13

**«Прамая лінія»**

## СЯМ'Я МАЕ ПРАВА НА ПАДТРЫМКУ

**Якія новыя віды сямейных дапамог з'явіліся сёлета? На якую падтрымку ад дзяржавы ўвогуле могуць разлічваць сем'і? Хто можа атрымаць мацярынскі капітал? Як можна будзе ім распарадзіцца?**

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць **намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандру Аляксеевічу РУМАКУ** падчас «прамой лініі» «Сацыяльная падтрымка сям'і», якая пройдзе ў рэдакцыі «Звязды» **16 чэрвеня з 11 да 12 гадзін.**

Задаць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66** і **8 (017) 287 18 71.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэл. **8 (017) 287 18 29** у працоўны час.

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

■ Парламенцкі дзённік

# Хакераў прыцягнуць да адказнасці з 14 гадоў,

## а схаваная рэклама тытуню і алкаголю будзе забаронена

**Палата прадстаўнікоў разгледзела і прыняла шэраг законапраектаў. Сярод іх унясенне дапаўненняў і змяненняў у некаторыя кодэксы. Так, прапануецца прыцягваць да адказнасці за крадзяжы, якія здзяйсняюцца з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі, з 14 гадоў. Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін СУКАЛА, прадстаўляючы законапраект у першым чытанні, патлумачыў, што ў КК прапануецца ўнесці змены, якія зніжаюць узроставую планку па некаторых артыкулах.**

### Не злоўжывай

Законапраектам прапануецца памяняць арт. 27 «Узрост, з якога наступае крымінальная адказнасць» КК. Сярод злачынстваў, пералічаных у ч. 2, гэта значыць дзеянняў, за якія прадугледжана адказнасць для асоб ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў, з'яўляюцца арт. 212 (крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі) і арт. 415 (ухіленне ад адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі).

Не менш цікавымі з'яўляюцца папраўкі ў закон «Аб рэкламе», якія прыняты ўжо ў другім чытанні. Першае чытанне адбылося ў кастрычніку 2014 года. Як растлумачыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты Прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Леанід КАВАЛЕВІЧ**, дакумент накіраваны на ўдасканаленне прававога рэгулявання адносін, якія звязаны з папярэджаннем размяшчэння, распаўсюджвання рэкламы алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў пад выглядам рэкламы іншых тавараў (работ, паслуг), арганізацый і грамадзян, і накіраваны на павышэнне эфектыўнасці мер па папярэджанні і пераадоленні п'янства, алкагалізму і тытунекурэння, а таксама зніжэнне ўзроўню спажывання алкаголю і тытуню насельніцтвам, памяншэнне негатыўных наступстваў іх спажывання для грамадства.

Апроч іншага, паводле слоў дэпутата, папраўкамі прадугледжваецца прывядзенне тэрміналогіі закона «Аб рэкламе» да адпаведнасці з патрабаваннямі іншых заканадаўчых і міжнародна-прававых актаў, якія складаюць нарматыўную прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

### Супраць шпіянажу і наркотыкаў

Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытанні таксама папраўкі ў Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы Беларусі.

У прыватнасці, законапраект карэктуе артыкул 356 «Здрада дзяржаве» КК Беларусі. Прапануецца лічыць здрадай дзяржаве выдачу дзяржсакрэтаў не толькі іншай дзяржаве, замежнай арганізацыі ці іх прадстаўніку, але таксама міжнароднай арганізацыі або яе прадстаўнікам. З артыкула таксама выключаны тэрмін «агентурная дзейнасць». Акрамя таго, з артыкула выключаецца частка 2, якая абвяшчае, што дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, спалучаныя з забойствам, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 10 да 25 гадоў, пажыццёвым зняволеннем або смяротным пакараннем з канфіскацыяй маёмасці ці без.

З КК таксама прапануецца выключыць артыкул 356-1 «Устанаўленне супрацоўніцтва са спецыяльнай службай, органам бяспекі або разведвальным органам замежнай дзяржавы», а артыкулы 358 «Шпіянаж» і 358-1 «Агентурная дзейнасць» выкладаюцца ў новай рэдакцыі. У тым ліку ў артыкул 358 уводзіцца тэрмін «міжнародная арганізацыя».

У сваю чаргу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Эдуард СЯНЬКЕВІЧ** растлумачыў, што ўнясенне паправак у беларускае заканадаўства ў першую чаргу абумоўлена фарміраваннем Еўразійскага эканамічнага саюза і неабходнасцю ўніфікацыі заканадаўства яго краін-удзельніц. Напрыклад, папраўкі ўніфікуюць падыходы да супрацьдзеяння на тэрыторыі ЕАЭС кантрабандзе і абароту наркотыкаў.

### Новае рашэнне

Першае чытанне прайшлі дапаўненні і змяненні ў некаторыя кодэксы, якія тычацца судаводства. У тым ліку ў законапраекце досыць шмат артыкулаў пра апеляцыйную дзейнасць, якія прапануецца ўнесці ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс. Важнасць артыкулаў у тым, што дзеючая рэдакцыя кодэкса прадугледжвае касацыйнае абскарджанне і апратэставанне прысудаў. Касацыя прадугледжвае толькі праверку рашэння ніжэйстаячага суда вышэйстаячым, але не даследаванне новых доказаў. Таму пры касацыйнай вытворчасці магчыма альбо пацвярджэнне папярэдняга рашэння, альбо яго адмена, а пры апеляцыйным можа быць вынесена новае рашэнне.

А вось дапаўненні ў закон «Аб таварных біржах» прыняты ў другім чытанні. Папраўкі, як мяркуецца, ліквідуюць бар'еры пры доступе на рынкі ЕАЭС. Законапраект прадугледжвае магчымасць удзелу замежных юрыдычных асоб у біржавых таргах. Вызначаецца і дадатковая функцыя таварнай біржы — арганізацыя і развіццё біржавой лагістыкі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

# БЕЗ САКРЭТАЎ

**Наша краіна плануе прадастаўляць ураду ЗША інфармацыю пра рахункі і іншыя актывы рэзідэнтаў гэтай краіны (фізічных і юрыдычных асоб), якія вядуць гаспадарчую дзейнасць або маюць рахункі на тэрыторыі Беларусі.**

Такім чынам, праект закона «Аб ратыфікацыі пагаднення паміж урадам Беларусі і кіраўніцтвам Злучаных Штатаў Амерыкі аб паляпшэнні выканання міжнародных падатковых правілаў і рэалізацыі закона ЗША аб падатковым кантролі рахункаў у замежных фінансавых установах» плануецца разгледзець на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў 26 чэрвеня. Пра гэта паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Віктар ВАЛЮШЫЦКІ.**

Дэпутат растлумачыў, што гэта робіцца для паляпшэння падаткаабкладання, абмену інфармацыяй, а таксама большай празрыстасці ўсіх фінансавых узаемаадносін. Гэта звычайная практыка, бо сёння падобнае пагадненне ратыфікавана 59 дзяржавамі. Перадавацца яна будзе раз на год, прыкладна ў верасні за мінулы год.

Старшыня камісіі ўдакладніў, што ў ідэале абмен падобнай інфармацыяй павінен быць узаемным. У сувязі з гэтым ён дадаў, што сустрэчнае пытанне беларускім бокам аб прадастаўленні інфармацыі падатковымі органамі ЗША аб рэзідэнтах нашай краіны ў іх таксама ўздымалася. Магчыма, што гэта будзе наступным этапам. А пакуль разглядаецца рашэнне аб ратыфікацыі пагаднення ў аднабаковым парадку.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

■ Тры пытанні да ўлады

# ЯНЫ ЎСЁ РОЎНА ВЕРНУЦЦА!



**Ганцаўшчына — самая што ні ёсць глыбінка Палесся. Яшчэ Якуб Колас апісаў асаблівасці гэтага краю, цяжкасці, якія стварыла людзям прырода найперш балотамі. Расказаў класік і аб працавітых самабытных палешуках. Галоўным чынам меліярацыя змяніла ўклад жыцця былых насельнікаў балотных мясцін. У апошняе дзесяцігоддзе раён стабільна развіваецца, хоць сельгаспрадпрыемствы працуюць ва ўмовах рызыкоўнага земляробства — меліяраваныя землі асабліва адчувальныя да замаразкаў, ападкаў, спёкі. Устойліва функцыянуе сацыяльная сфера... Сёння традыцыйныя тры пытанні мы адрасуем старшыні Ганцавіцкага райвыканкама Аляксандру САЛАНЕВІЧУ.**

***— Чым жыве гэтымі днямі Ганцавіцкі раён? Якое пытанне стаіць у парадку дня кіраўніка раёна?***

— Канкрэтна сёння (11 чэрвеня. — **Аўт.**) у нас выпускны баль. Ужо некалькі гадоў запар мы збіраем разам усіх гарадскіх і сельскіх выпускнікоў у Ганцавічах. Бачыце, ёсць свае перавагі і ў невялікага раёна. Усяго ў горадзе і раёне ў нас 15 школ, якія падрыхтавалі сёлета 240 выпускнікоў. І гэта, лічу, цудоўная магчымасць сустрэцца хлопцам і дзяўчатам, іх бацькам і настаўнікам, павіншаваць адно аднаго, павесяліцца, пагаварыць пра будучыню. Такія святы спрыяюць агульнаму ўзнёсламу настрою, еднасці пачуццяў і думак. На такім мерапрыемстве не ўзнікае спакусы ў выпускнікоў сабрацца нейкай асобнай групкай ды яшчэ захапіць піва ці чаго мацнейшага.

Работнікі культуры падрыхтавалі праграму, згодна з якой раённы баль пачынаецца а палове дзявятай вечара. Да гэтага пройдуць урачыстыя сходы ў кожнай школе, на якіх учарашнім адзінаццацікласнікам уручаць атэстаты. Потым аўтобусы даставяць выпускнікоў, іх бацькоў і настаўнікаў з вёсак раёна ў Ганцавічы. Тут, на галоўнай плошчы горада, і пачнецца свята. Спачатку мы ўручым медалістам іх узнагароды, адзначым прэміямі іх настаўнікаў, шчыра падзякуем бацькам за выхаванне выдатнікаў. А затым — песні, танцы, дыскатэка, забаўляльная праграма, якая скончыцца феерверкам на досвітку. Потым аўтобусы развязуць «віноўнікаў» урачыстасці па дамах.

***— Ці многа ў вас гэтым разам медалістаў?***

— На здзіўленне многа: 24 чалавекі, гэта значыць, кожны дзясяты выпускнік. Такіх вынікаў не могуць згадаць нават самыя вопытныя нашы педагогі. Напрыклад, на наступны год прагназуецца недзе каля дзесятка медалістаў. А цяпер так выйшла, што сабраліся разам нашы разумнікі і разумніцы. Такія, як вучаніца ганцавіцкай школы №3 Яўгенія Пракапчук. Дзяўчына не толькі выдатна вучыцца, займаецца грамадскай работай, яна яшчэ піша цудоўныя вершы, з якімі не раз выступала на раённых мерапрыемствах. На баль прыйдзе нямала таленавітых, цікавых яе равеснікаў з іншых школ.

***— Цікава, што старшыня райвыканкама з ходу называе выпускнікоў па імёнах і прозвішчах. А не шкада вам трошачкі, Аляксандр Паўлавіч, праводзіць іх у дарослае жыццё? Гэтыя медалісты — патэнцыйныя студэнты сталічных і іншых ВНУ, многія з іх, напэўна, застануцца ў вялікіх гарадах...***

— Ну што вы! Наша моладзь — наша надзея. Яны вывучацца ва ўніверсітэтах, хай вучацца яшчэ далей, хай становяцца першымі велічынямі, стажыруюцца за мяжой. А потым, верым, успомняць і пра малую радзіму, вынайдуць спосабы, як зрабіць, напрыклад, нашу сельскую гаспадарку менш залежнай ад капрызаў прыроды. Іншыя з іх, магчыма, стануць бізнесменамі і адкрыюць тут такія перспектыўныя вытворчасці, што цалкам вырашыцца праблема занятасці. А нехта з іх, можа, праславіць нашу беларускую літаратуру, у якой багатыя традыцыі на Ганцаўшчыне. У Год моладзі нашы асаблівыя спадзяванні на маладых.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Інфраструктура



# ШМАТ ДАРОГ НЕ БЫВАЕ

## Частку МКАД-2 здадуць у эксплуатацыю не пазней чым у лістападзе

**Сетка аўтадарог агульнага карыстання Беларусі складае больш за 86 тыс. км, у тым ліку каля 15 тыс. км рэспубліканскіх, па якіх ідзе асноўны груза- і пасажырапаток, і каля 71 тыс. км мясцовых дарог. Яшчэ не на ўсіх напрамках узведзена неабходная колькасць дарожнага палатна, ды і старому патрабуецца абнаўленне. Рэканструкцыя трасы М6 Мінск—Гродна пачнецца ў найбліжэйшы час, таксама плануецца рэканструкцыя аўтадарогі М10. Што тычыцца сталіцы, то актуальнымі пытаннямі дарожнай карты тут з'яўляюцца будаўніцтва МКАД-2 і стварэнне новых транспартных развязак.**

### АБ'ЁМ ФІНАНСАВАННЯ ПАВЯЛІЧАЦЬ

Першы этап будаўніцтва МКАД-2 будзе завершаны не пазней чым у лістападзе гэтага года. Як растлумачыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксандр ГАЛАЎНЁЎ**, гэта ўчастак ад аўтамабільнай дарогі М3 Мінск—Віцебск да аўтамабільнай дарогі М6 Мінск—Гродна.

«Мы мяркуем завяршыць работы ў лістападзе, прынамсі ўвод у эксплуатацыю павінен адбыцца не пазней за гэты перыяд. Зараз на аб'екце ідзе інтэнсіўная кладка цэментабетонных пакрыццяў, добраўпарадкаванне няскончаных участкаў», — распавёў Аляксандр Галаўнёў.

Усяго ж будаўніцтва МКАД-2 плануецца ажыццявіць у два этапы. Як чакаецца, участак другой МКАД ад аўтадарогі М6/Е28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі) да аўтадарогі М1/Е30 Брэст (Казловічы) — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі (Рэдзькі) павінен быць уведзены, згодна з зацверджаным каляндарным планам, да 1 студзеня 2017 года.

Не менш цікавым фактам для сталічных аўтаўладальнікаў з'яўляецца і тое, што да 2020 года ў Мінску плануецца пабудаваць 10 новых транспартных развязак з падземнымі пешаходнымі пераходамі. Як распавёў **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК**, на дадзены момант праходзіць узгадненне праекта праграмы развіцця вулічна-дарожнай сеткі Мінска на 2015-2020 гады. У адпаведнасці з ім, акрамя 10 развязак, прадугледжаны рэканструкцыя 25 аб'ектаў працягласцю 23 км і будаўніцтва 24 новых аб'ектаў працягласцю 18,4 км. Найбольш значныя з іх — рэканструкцыя вул. Парніковай ад вул. Макаёнка да вул. Філімонава, падаўжэнне вул. Жукоўскага ад вул. Аэрадромнай да вул. Кіжаватава з транспартнай развязкай «Мінск—Мір», будаўніцтва першага гарадского транспартнага кальца на ўчастку ад вул. Харкаўскай да вул. К. Лібкнехта. Дзмітрый Янчык таксама адзначыў, што транспартныя развязкі плануюць будаваць у найбліжэйшы час. На развіццё вулічна-дарожнай сеткі ў 2015-2020 гадах плануецца выкарыстаць 8 трлн 615 млрд рублёў. Фінансаванне будзе павялічвацца з кожным годам.

**Да 2020 года ў Мінску плануецца пабудаваць 10 новых транспартных развязак з падземнымі пешаходнымі пераходамі.**

### ТРАСЫ Ў КРЭДЫТ

Рэканструкцыя трасы М6 Мінск—Гродна таксама пачнецца ў найбліжэйшы час. Для рэалізацыі праекта па рэканструкцыі М6 Сусветны банк выдзяляе крэдыт у памеры 250 млн долараў.

«Зараз ідзе працэдура выбару падрадчыка — міжнародныя таргі. У хуткім часе рэалізацыя праекта пяройдзе ў практычную плоскасць», — адзначыў Аляксандр Галаўнёў.

Сёння таксама прапрацоўваецца пытанне рэканструкцыі аўтадарогі М10. Як растлумачыў Аляксандр Галаўнёў, Мінтранс разлічвае рэалізаваць гэты праект на ўмовах дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Удзельнічаць у праекце плануе Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця. Для прыцягнення патэнцыйных інвестараў на наступным тыдні Мінтранс прадставіць праект па рэканструкцыі М10 на форуме ў Лондане. Працягваецца рэканструкцыя дарогі М5 Мінск—Гомель. Зараз актыўна працуюць на ўчастку Бабруйск—Жлобін. Усе работы фінансуюцца за кошт ільготнага крэдыту Эксімбанка КНР. Раней рэканструкцыя М5 па параметрах І катэгорыі правялі на ўчастках Пухавічы—Бабруйск, Жлобін—Гомель. На гэтыя мэты былі накіраваны крэдытныя сродкі Беларусбанка і Эксімбанка КНР.

«Рэканструкцыя будзе завершана ў 2016 годзе, уся дарога М5 будзе адпавядаць параметрам першай катэгорыі», — заявіў Аляксандр Галаўнёў.

У 2015 годзе працягнуць работы па распачатым раней участку аўтадарогі Р23 Мінск—Мікашэвічы. На іх фінансаванне выдзяляецца крэдыт Банка развіцця Рэспублікі Беларусь. Усяго сёлета плануецца правесці бягучы рамонт на 780 км дарог і 1682 пагонных метрах мастоў, капітальны рамонт — на 39 км дарог і 1374 пагонных метрах мастоў. Пасля рэканструкцыі і новага будаўніцтва ў эксплуатацыю намечана ўвесці 81 км дарог.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

■ Сталічны час

# ЖАБІНЫ ЛАПКІ ПА-БЕЛАРУСКУ,

## або Калі ў Мінску з'явіцца нацыянальнае бістро

**Гэтымі днямі ў сталіцы праходзіць тыдзень беларускай кухні. Пра развіццё яе сеткі, а таксама пра найбольш актуальныя пытанні сталічнага спажывецкага рынку нам сёння расказвае намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй ДАМАРАЦКІ.**

### НЕ ТОЛЬКІ ДРАНІКІ

Пытанне стварэння гарадской сеткі беларускай нацыянальнай кухні ніколі не знікала з парадку дня. Чэмпіянат свету па хакеі паказаў: больш за 80% гасцей хацелі пакаштаваць у Мінску менавіта нацыянальныя стравы. І калі на час спартыўных спаборніцтваў рэстараны абавязалі займець у пераліку страў беларускі пачастунак, то цяпер многія вярнуліся да свайго звычайнага меню.

«Сёння каля 60—70% устаноў харчавання маюць нацыянальную кухню, але яны не маюць ніякай сістэматызацыі, — заўважыў Андрэй Дамарацкі. — Таму цяпер мы просім, рэкамендуем, а з часам будзем уводзіць і на заканадаўчым узроўні, каб у кожным рэстаране агульнага профілю была старонка беларускіх страў».

Што ўвойдзе ў іх шэраг? Ніякага абавязковага пераліку страў на чале з дранікамі не будзе. Кожны рэстаран можа стварыць свой уласны спіс і нават прыдумаць свае фірмовыя стравы — галоўнае, каб яны былі беларускімі. А гэтае азначэнне, пагадзіцеся, дастаткова шырокае.

«Любую страву, якую мы цяпер ядзім, можна смела называць беларускай. Мы нават падчас абмеркавання гэтага пытання жартавалі, што калі Напалеон прыйшоў у Беларусь і яму не было чаго з'есці, ён знайшоў жабіны лапкі і пасля завёз іх у Францыю. А ўвогуле, многія ў дзяцінстве прыязджалі ў вёску, дзе бабулі заўсёды гатавалі нешта смачнае. Гэта і ёсць беларуская кухня».

Такім чынам, галоўнае ў пагоні за беларушчынай на кухні, як той казаў, не перасаліць. Бо, скажам, беларускія сушы — гучыць неяк падазрона.

«Цяпер ёсць каля 30 недзяржаўных аб'ектаў, якія спецыялізуюцца на нацыянальных стравах. У найбліжэйшы час мы плануем адкрыць шэраг кавярняў, большую частку меню якіх будуць складаць менавіта беларускія стравы — так званыя беларускія бістро».

Плануецца, што тры такія аб'екты пад брэндам «Радзівілаўскі» з'явяцца ў Мінску на пачатку наступнага года.

### МІНІ-РЫНКІ АДРОДЗЯЦЬ

Яшчэ адной праблемай для горада застаюцца стыхійныя рынкі. Толькі за першы квартал на нелегальных гандляроў было складзена больш за 500 пратаколаў. Але сёння парушальнікаў пакаралі, а заўтра яны з'яўляюцца ў новым месцы.

«Напэўна, забароннымі мерамі не заўсёды можна вырашыць праблему. Таму ў нашых планах адрадзіць у сталіцы міні-рынкі», — паведаміў намеснік старшыні.

Ён таксама нагадаў, што з 1 чэрвеня амаль на ўсіх гарадскіх рынках бясплатна прадастаўляюцца гандлёвыя месцы пенсіянерам і інвалідам для рэалізацыі імі да 20 кг сельскагаспадарчай прадукцыі, вырашчанай на зямельным участку. Па словах Андрэя Дамарацкага, штодня гэтай магчымасцю карыстаюцца каля 500 чалавек. Аднак не ўсім пажылым людзям зручна дабірацца да такіх месцаў, таму і паўстала пытанне аб вяртанні міні-рынкаў.

Андрэй Дамарацкі звярнуў увагу і на яшчэ адну праблему, якая датычыцца сталых людзей, што жывуць у прыватных сектарах, дзе не хапае крам. Цяпер разглядаецца магчымасць сумесна з сеткай «Еўраопт» арганізаваць дастаўку прадуктаў такім людзям. Мяркуецца, што зрабіць заказ можна будзе па тэлефоне.



### ЗАБАРОНА НА АЛКАГОЛЬ — ДЛЯ ДЭБАШЫРАЎ

Яшчэ адна тэма, якую закрануў намеснік старшыні, датычылася абмежаванняў продажу алкаголю падчас школьных выпускных.

«Мы выдатна ведаем, што калі выпускнікі захочуць адзначыць, яны закупяцца спіртным загадзя. Але гэтыя абмежаванні накіраваны не на іх, а на тых людзей, якія могуць сапсаваць свята», — падкрэсліў Андрэй Дамарацкі.

Гэтым і выклікана забарона на рэалізацыю алкагольнай прадукцыі, якая ўводзіцца ў горадзе 15 чэрвеня з 22 вечара да 9 раніцы. Як адзначыў намеснік старшыні выканкама, гэта не пацягне вялікіх страт у тавараздвароце. Пры гэтым ён спаслаўся на звесткі ГУУС, паводле якіх шмат злачынстваў адбываецца менавіта пасля таго, як людзі вып'юць і, адчуўшы, што ім «не хапіла», пойдуць дакупляць алкаголь.

Калі абмежаванне на продаж алкаголю будзе эфектыўным, яго будуць прымяняць і надалей. «У многіх еўрапейскіх краінах, нават дзе спажыванне алкаголю меншае, чым у Беларусі, гэтая мера дзейнічае», — дадаў Андрэй Дамарацкі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

■ Шпацыр па Камароўцы

# НЕ РАДУЕ ПАКУЛЬ ЛЕТА — РАСЧАРАВАЛІ І КЛУБНІЦЫ...

**...Нарэшце паспеў адзін з галоўных ласункаў лета — клубніцы. Не ведаю людзей, якія адмовіліся б ад жывых вітамінаў «пад соусам» са смятаны і цукру. Доўгачаканыя ягадкі ўжо красуюцца і на прылаўках Камароўкі. Што маем у асартыменце? На сталічны рынак клубніцы прыехалі з Драгічына, Кобрына, Брэста, Лунінца, Гродна. Ёсць невялікія і непрыметныя ягады, іншыя — могуць пахваліцца добрым памерам і чырванню: просіш «на зуб» пакаштаваць, а драбнюткіх у скрыньцы і няма.**




— Вазьміце сунічныя, самы лепшы з беларускіх гатункаў, — рэкламуе свой тавар прадавачка. На цэнніку тлустым фламастарам пазначана «вельмі салодкія». Але на паверку ягада гарчыць.

— Надвор'е для клубніц не задалося, — апраўдваецца дзяўчына, злавіўшы мой здзіўлены позірк.

Рушым далей. Нямногія прадаўшчыцы дазваляюць праверыць свой тавар. «Дома пакаштуеце», — бурчыць жанчына, незадаволеная роспытамі пра смак ягад. У яе суседкі клубніцы брудныя — дэгустацыя адмяняецца. Затое зняць пробу з гродзенскага прысмаку — аднаго з самых дарагіх (55 тысяч за кілаграм) — далі без праблем. На смак усе ягады мне здаліся аднолькавымі — нават самыя салодкія адданы кіслінкай. У такім выпадку не бачу сэнсу пераплачваць за знешнюю прыгажосць. Сярэдняя цэнавая катэгорыя — 35 тысяч рублёў за кілаграм. Ёсць больш бюджэтныя варыянты — па 25 тысяч.

Паўлітровы слоік першых лясных суніц аблегчыць кашалёк роўна на 100 тысяч рублёў. Кілаграм ледзь не чорных, «глянцавых» малдаўскіх чарэшань прапануюць забраць за 30-40 тысяч. А гэтую ж госцю з Іспаніі, у якой плады ледзь не ўдвая большыя за малдаўскія, прадаюць рэкордна дорага — па 150 тысяч рублёў за кілаграм.

Нарэшце паказалася маладая бульба. Кілаграм буйной, што так і просіцца ў рондаль, лёгка знойдзеце па 15 тысяч рублёў. Да такой стравы было б няблага дадаць салату з памідораў і агуркоў. Апошнія з Пінска ў сярэднім каштуюць 10 тыс. рублёў за кілаграм. Мясістыя беларускія таматы ёсць па 24 тысячы рублёў за кілаграм, іспанскія — па 18 тыс., а ўкраінскія — па 22 тыс. Кілаграм невялічкіх чэры абмяняюць на 30 тысяч рублёў. Затое ўражваюць габарытамі азербайджанскія памідоры: за кіло «волатаў» не шкада аддаць і 35 тыс. За 45 тысяч рублёў атрымаеце кілаграм сімпатычных баклажанаў альбо два кіло кабачкоў.

З'явіліся кавуны, але яны пакуль што мала каму будуць па зубах — за кілаграм «паласаціка» жадаюць атрымаць 40 тысяч рублёў. З імі ў адной цане нектарыны. Амаль па такім жа коштам ідуць і лімоны, аднак на адным прылаўку былі заўважаны цытрусы «новага ўраджаю» — па 75 тыс. за кілаграм. За гэтыя грошы можна набыць кіло гранатаў, амаль два кілаграмы апельсінаў ці мандарынаў і ледзь не тры кілаграмы бананаў. Інжырныя персікі ідуць па кошце іранскіх разынак гатунку «Голд» — 90 тысяч рублёў за кілаграм. Як ні дзіўна, адну коштавую планку трымаюць бананы і морква — у сярэднім каштуюць 21 тыс. за кілаграм. Прыглядзеўшыся да цэнніка, заўважыла — морква заморская, прыехала з Ізраіля. Хочаце паласавацца ўзбекскімі абрыкосамі — калі ласка, 35 тысяч рублёў за кілаграм. Іспанскі варыянт даражэйшы на 15 тыс.

Напрыканцы шпацыру заўважыла вялікую чаргу. Міжволі падумалася — пэўна, прывезлі танныя да салодкія клубніцы. Але людзі чакалі... яблыкі. Дарэчы, гатункі «Лігаль», «Чорны прынц», «Голдэн», «Ананаснае» цяпер у сярэднім каштуюць 17-20 тысяч рублёў за кілаграм. А кілаграм жоўтай у чырвоных крапінкі грушы «фарэлы» стане вашым усяго за 65 тыс. — на такую ж суму можна забраць з прылаўка два кілаграмы «бэры».

**Кацярына РАДЗЮК**

■

**ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ»**

*(кошт за кілаграм, калі не пазначана іншае)*

| | |
|---|---|
| Сала салёнае | 130 тыс. |
| Бараніна (філе) | 115 тыс. |
| Свініна (філе) | 130 тыс. |
| Грудзінка свіная (на засолку) | 75 тыс. |
| Бройлерная кураня | 31-38 тыс. |
| Ялавічына | 95-150 тыс. |
| Фарш катлетны (свініна плюс ялавічына) | 55 тыс. |
| Яйкі курыныя (дзясятак) | 13-14 тыс. |
| Яйкі перапяліныя (20 штук) | 22-23 тыс. |
| Грэчка (800 грамаў) | 12-13 тыс. |
| Рыс прапараны (800 грамаў) | 15 тыс. |
| Алей сланечнікавы рафінаваны (850 грамаў) | 18-23 тыс. |
| Зялёная цыбуля (пучок) | 3-5 тыс. |
| Кроп (пучок) | 8-10 тыс. |
| Пятрушка (пучок) | 5 тыс. |
| Шчаўе (пучок) | 5 тыс. |
| Часнок (1 штука) | 5-15 тыс. |
| Радыска (пучок) | 10-15 тыс. |
| Шампіньёны | 32-39 тыс. |

■ Абітурыент-2015

# Попыт і прапанова

## Колькасць бюджэтных месцаў у дзяржаўных ВНУ скарацілася на 300, а платных — на 15 тысяч

**Сёлета студэнтамі дзяржаўных універсітэтаў змогуць стаць 66,7 тысячы чалавек. З іх амаль 28 тысяч абітурыентаў маюць шанц паступіць на бюджэт (22,7 тысячы чалавек — на дзённую форму навучання, 5,3 тысячы — на завочную). План прыёму ў прыватныя ВНУ скарацілі на 44 працэнты: месцаў у такіх установах вышэйшай адукацыі хопіць прыкладна для дзевяці тысяч будучых першакурснікаў. У той жа час колькасць выпускнікоў школ таксама меншае: у чэрвені адзінаццаты клас скончаць 54 тысячы хлопцаў і дзяўчат.**

— Парадак фарміравання кантрольных лічбаў прыёму — гэта складаны працэс, які ўлічвае інтарэсы рынку і заказчыкаў кадраў, пэўныя грамадскія запыты, — каментуе сітуацыю **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ**. — Адным з першых этапаў з'яўляецца прагноз асноўнай і дадатковай патрэбы ў работніках, маладых спецыялістах. Ён робіцца з улікам узроўню адукацыі, кваліфікацыі, кампетэнцый, якія той ці іншы спецыяліст павінен мець. Пры фарміраванні кантрольных лічбаў выкарыстоўваюцца звесткі, што тычацца працаўладкавання выпускнікоў, стану рынку працы: якія вакансіі ёсць цяпер, які прагноз іх змянення.

Падчас першага пасяджэння Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ўступнымі выпрабаваннямі **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што ў Беларусі распрацоўваецца механізм дзяржзаказу на падрыхтоўку кадраў. «На фарміраванне попыту на прафесіі ўплывае не толькі эканамічная сітуацыя, але і дэмаграфічныя паказчыкі, — кажа намеснік прэм'ер-міністра. — Напрыклад, у гэтым годзе паменшаны прыём у медыцынскія ВНУ. Гэта зроблена з улікам патрэбы ва ўрачах праз шэсць гадоў, калі сённяшнія абітурыенты стануць маладымі спецыялістамі».

Па-ранейшаму не хапае персаналу з прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, кваліфікаваных кадраў у галіне інфармацыйных тэхналогій. Каб падладзіцца пад запыт рынку, шэраг ВНУ адкрылі новыя профілі. БДУ прапаноўвае абітурыентам спецыяльнасць «геаінфармацыйныя сістэмы і сеткі», Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт — напрамак «Нацыянальная эканоміка». Набор на профіль «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у харчовай прамысловасці)» распачне Магілёўскі ўніверсітэт харчавання.

Падаваць дакументы ва ўстановы вышэйшай адукацыі як на бюджэтную, так і на платную форму навучання трэба з 8 па 15 ліпеня. Выключэннe складае «завочка» ўніверсітэтаў сельскагаспадарчага профілю, дзе прымаць дакументы будуць з 1 па 30 лістапада. Залічэнне абітурыентаў на бюджэт у ВНУ МУС і МНС, Інстытуце пагранслужбы і Ваеннай акадэміі пройдзе па 23 ліпеня, у дзяржаўных акадэміях мастацтваў, музыкі і ўніверсітэце культуры — па 29 ліпеня, у іншых установах вышэйшай адукацыі — па 25 ліпеня. На платныя месцы сілавых ВНУ залічваць будуць па 30 ліпеня, універсітэтаў сферы культуры — па 1 жніўня, астатніх устаноў — па 4 жніўня.

— Праца камісіі па кантролі за ўступнымі выпрабаваннямі павінна быць арганізавана так, каб не даць ніякіх шанцаў ахвотным трапіць у ВНУ з чорнага ходу. Не сакрэт, што сярод абітурыентаў штогод знаходзяцца тыя, хто не мае дастатковых ведаў і спрабуе абысці закон з дапамогай членаў прыёмных ці прадметных экзаменацыйных камісій, — выказалася Наталля Качанава.

**Пытанні па ўступнай кампаніі выпускнікі і іх бацькі могуць задаць на «гарачых» лініях Міністэрства адукацыі (нумар 223-43-12) і Дзяржаўнай камісіі (327-66-80). Намеснік прэм'ер-міністра запэўніла, што ўсе звароты будуць разглядацца хутка і аб'ектыўна.**

Дарэчы, першыя вынікі ЦТ стануць вядомымі 26 чэрвеня. У гэты дзень свае балы ўбачаць абітурыенты, што будуць здаваць беларускую мову. Як паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**, тэрмін, за які праверяюцца тэсты, застанецца тым жа — 12 дзён. «Чым старанней мы выканаем усе аперацыі, прадугледжаныя тэхналагічным працэсам, тым меней потым будзе зваротаў па замене сертыфікатаў», — патлумачыў ён.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

# ДАВЯРАЙ, ДЫ ПРАВЯРАЙ,

## або Як не трапіць пад перадвыбарную маніпуляцыю

**Якую ролю адыгрываюць сацыялагічныя даследаванні падчас выбарчай кампаніі? Ці варта давяраць інфармацыі экзітполаў? Якія задачы павінны ставіць перад сабой сацыёлагі і як правільна праводзіць сацапытанні? Як адрозніць сапраўднага даследчыка ад махляра? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі падчас «круглага стала» часопіса «Беларуская думка», прысвечанага сацыялогіі ў выбарчых працэсах.**



Мадэратарам дыскусіі выступіў **галоўны рэдактар часопіса Вадзім ГІГІН.** Ён адзначыў, што да сацыялагічных звестак увага заўсёды павышаная. Аднак у чым прынцыповае адрозненне сацыялагічных даследаванняў менавіта ў выбарчых працэсах?

**Дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ доктар сацыялагічных навук, прафесар Давід РОТМАН** перакананы, што вынікі такіх даследаванняў важныя для ўсіх, бо даюць інфармацыю аб ходзе электаральнага працэсу. Пры гэтым яны павінны не проста паказваць лічбы, а адказваць на чатыры пытанні: «што адбываецца?», «чаму?», «што зрабіць, каб зняць негатыўныя наступствы таго, што адбываецца?», «што будзе пасля?».

«Даследаванні не павінны даваць нейкія кропкавыя вынікі. Гэта няправільна, павінен быць аналіз. Падчас сацыялагічных даследаванняў трэба выяўляць праблемныя сітуацыі (чым людзі задаволены, а чым не задаволены), каб ведаць, над чым працаваць», — упэўнены Давід Ротман.

У прыватнасці, па словах прафесара, мала проста высветліць рэйтынгі кандыдатаў у дэпутаты або прэзідэнты, неабходна адказаць на пытанне, ад чаго яны залежаць і як фарміруюцца.

**Нярэдка па кватэрах пачынаюць хадзіць прадстаўнікі розных сект, якія могуць прадстаўляцца даследчыкамі. Каб не трапіць у пастку махляроў, неабходна правяраць пасведчанне і пашпарт.**

У сваю чаргу **дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта (ІАЦ) Аляксей ДЗЕРБІН** адзначыў, што самыя дакладныя вынікі даюць электаральныя сацыялагічныя даследаванні непасрэдна напярэдадні выбараў.

Справа ў тым, што на працягу перадвыбарнай кампаніі розныя інфармацыйныя акцыі або падзеі ўплываюць на настрой грамадства, таму вынікі даследаванняў могуць адрознівацца.

Якую ролю адыгрываюць у гэтым экзітполы (апытанні людзей пры выхадзе з выбарчых участкаў)? **Начальнік упраўлення сацыялагічных даследаванняў ІАЦ Уладзімір ЛІТВІНОВІЧ** лічыць, што можна вылучыць некалькі функцый экзітполаў: па-першае, гэта форма грамадскага кантролю, па-другое, яны носяць інфармацыйна-забаўляльны характар. Начальнік упраўлення таксама адзначыў, што экзітполы часта памыляюцца.

«У 2004 годзе, калі ў ЗША было супрацьстаянне Джорджа Буша і Джона Кэры, перад абвяшчэннем афіцыйных вынікаў экзітпол агучыў свае звесткі, па якіх пераможцам станавіўся Кэры. Аднак афіцыйныя вынікі былі зусім іншымі. Экзітпол потым пералічыў усё і прызнаў, што памыліўся», — прывёў прыклад Уладзімір Літвіновіч.

«Катэгарычна нельга абвяшчаць вынікі апытанняў людзей на выхадзе з выбарчага ўчастка праз кожныя дзве ці чатыры гадзіны. Толькі праз 20—30 хвілін пасля закрыцця ўчасткаў яны могуць быць абвешчаны, але не сацыёлагамі, а заказчыкамі сацыялагічнага даследавання», — падкрэсліў Давід Ротман.

**Кіраўнік аналітычнага цэнтра ЕСООМ Сяргей МУСІЕНКА** прывёў прыклад нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы. Па яго словах, яшчэ ў сакавіку кандыдат Анджэй Дуда, па інфармацыі даследчыкаў, меў рэйтынг у 12%, у красавіку — 15%, а напачатку мая ўжо 29%.

«Многія прафесійныя даследчыкі казалі, што гэта — «столь». Але Анджэй Дуда стаў прэзідэнтам. Вось вам і прафесійныя ацэнкі», — заўважыў ён.

Аднак нярэдка памылкі ў даследаваннях бываюць і наўмыснымі. Па словах **дырэктара Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі доктара сацыялагічных навук, прафесара Ігара КАТЛЯРОВА,** перад выбарамі з'яўляюцца псеўдаструктуры, якія выкарыстоўваюць сацыялогію з палітычнымі мэтамі. Апроч таго, шэраг структур спрабуе выкарыстаць сацыялагічныя даследаванні дзеля вырашэння сваіх праблем. Аднак, як падкрэсліў Аляксей Дзербін, прафесійны гонар і этыкет сапраўдных сацыёлагаў не дазваляюць ім скажаць вынікі: гэта нанесла б шкоду навуцы ўвогуле, а таксама кінула б цень на аўтарытэтныя структуры.

Гаворачы аб прафесіяналізме сацыёлагаў, Давід Ротман звярнуў увагу, што нярэдка па слядах тых, хто праводзіць апытанне на даму, па кватэрах пачынаюць хадзіць прадстаўнікі розных сект, якія могуць прадстаўляцца даследчыкамі. Каб не трапіць у пастку махляроў, у работнікаў сацыялагічных структур, што прыйшлі праводзіць даследаванне, неабходна правяраць пасведчанне і пашпарт.

Дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў таксама распавёў, што кожны інтэрв'юер мае маршрутны ліст, дзе запісаны дакладныя адрасы і інфармацыя аб рэспандэнтах: пол, узрост і, як правіла, кантактная інфармацыя.

**Мала проста высветліць рэйтынгі кандыдатаў у дэпутаты або прэзідэнты, неабходна адказаць на пытанне, ад чаго яны залежаць і як фарміруюцца.**

«Мы правяраем іх працу, перателефаноўваючы грамадзянам: удакладняем, ці быў даследчык, калі заходзіў, колькі часу правёў, якія пытанні задаваў. Калі мы даведваемся, што інтэрв'юер не заходзіў у гэтую кватэру, але паказаў яе ў анкеце, мы яго досыць жорстка караем», — дадаў ён.

Па словах Давіда Ротмана, здараюцца і выпадкі, калі пільныя грамадзяне выклікаюць міліцыю і праваахоўнікі затрымліваюць работнікаў сацыялагічных структур. Аднак пасля праверкі дакументаў усе пытанні здымаюцца.

Напрыканцы гутаркі Аляксей Дзербін паведаміў, што паводле даследавання, праведзенага ў лютым бягучага года, 91,2% беларусаў ведаюць пра тое, што ў 2015 годзе ў краіне праводзяцца прэзідэнцкія выбары. Пры гэтым 89,3% рэспандэнтаў плануюць прыняць у іх удзел. Апытана было 1653 чалавекі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

■ Заплаці падаткі

# Кватарантам прапануюць «сігналізаваць»

### А супраць ценявога абароту дзейнічае аперацыя «Чэк»

**Менавіта летам на другасным рынку арэнды прыватнага жылля ў буйных гарадах пачынаецца сезон мінімальнай актыўнасці патэнцыяльных спажыўцоў. Былыя студэнты пакідаюць здымныя кватэры, а новыя з'яўяцца толькі ў жніўні-верасні. Таму цяпер гаспадары пустога жылля спрабуюць адшукаць сабе кліентаў нават без афіцыйнага афармлення. Сталічныя кантралюючыя структуры да падобнай ракіроўкі ўжо падрыхтаваліся.**

Днямі інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах Беларусі па горадзе Мінску падрыхтавала спецыялізаваную акцыю пад назвай «Здаў кватэру — заплаці падаткі». Усе падрабязнасці падобнага мерапрыемства падатковай не раскрываюцца, аднак паведамляецца, што сёлета ў тэрмін з 15 па 19 чэрвеня будзе дзейнічаць «гарачая лінія». У рамках гэтай акцыі ўсе грамадзяне, якія маюць інфармацыю аб нелегальнай здачы кватэр у сталіцы, змогуць паведаміць пра гэта па тэлефонах: 306-50-96, 229-79-79.

### Да афіцыйнага афармлення трэба падыходзіць сур'ёзна

Тут адразу нагадаю, што цяпер дзейнічае адпаведны ўказ кіраўніка нашай дзяржавы, па якім забараняецца здаваць у арэнду жыллё, якое было пабудавана з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. Здаваць можна, але пры афармленні дакументаў у ЖЭСе трэба будзе паказаць даведку з банка пра тое, што крэдыт пагашаны.

Адпаведны дазвол на такую арэнду мясцовыя ўлады могуць даць у выключных выпадках і тады, калі крэдыт не пагашаны. Самыя вялікія шанцы на яго атрыманне ў маці-адзіночак — да гэтай катэгорыі стаўленне больш лаяльнае. Варта спрабаваць і ў тым выпадку, калі вы плаціце за адукацыю дзяцей і можаце гэта дакументальна даказаць. Можна паспрабаваць і тады, калі шмат сродкаў ідзе на лячэнне альбо калі пасля будаўніцтва жылля адбылося скасаванне шлюбу ці, не дай Божа, смерць уласніка жылля або члена сям'і. У любым выпадку перад тым, як аддаваць дакументы на атрыманне дазволу, неабходна сабраць разнастайныя даведкі аб усіх выдатках, тады ў вас будзе больш шанцаў.

### Здача «льготнай» кватэры можа каштаваць уладальніку да 5,4 млн рублёў

Ужо сёлета былі прыняты адпаведныя папраўкі ў Адміністрацыйны кодэкс № 243-З. Там існуе артыкул 23.86 пад назвай "Парушэнне парадку прадастаўлення жылых памяшканняў, пабудаваных (рэканструяваных) або набытых з прыцягненнем ільготнага крэдыту, па дагаворы найму або арэнды». Там, у прыватнасці, гаворыцца, што «прадастаўленне грамадзянінам жылога памяшкання (яго часткі), пабудаванага (рэканструяванага) або набытага з прыцягненнем ільготнага крэдыту, па дагавору найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду або па дагаворы арэнды жылога памяшкання да поўнага пагашэння льготнага крэдыту без дазволу адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі патрэбен такі дазвол, — цягне накладанне штрафу ў памеры ад чатырох да трыццаці базавых велічынь».

Атрымліваецца, што цяпер штрафы за падобнае парушэнне будуць вагацца ад 720 тысяч да 5 млн 400 тысяч рублёў. Крыху ніжэй у дакуменце гаворыцца, што за тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, памеры штрафу істотна павялічваюцца і будуць складаць ужо ад 30 да 50 базавых велічынь. А гэта ўжо — ад 5 да 9 млн рублёў.

**9.25** Навука будучыні.
**10.10** Папулярная навука.
**10.55, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**12.30** Больш чым фокусы.
**13.15** Гісторыя ежы.
**14.00** Першыя вялікія ўцёкі.
**14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.20** Дзікая прырода Расіі.
**17.10, 22.30** National Geographic: 125 дзіўных фота.
**17.55** Перш за ўсё — самалёты.
**18.40, 2.15** Найгоршае надвор'е ўсіх часоў?
**19.30, 0.00** Нябесная Брама.
**20.15, 3.00** Карставыя варонкі.
**21.00, 0.45, 3.45** Расследаванні авіякатастроф.
**22.55** Панарама 360°.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.36** З-за любові да машын.
**8.50, 15.30** Хуткія і гучныя.
**9.40, 16.20, 0.40, 6.24** У пагоні за класікай.
**10.30** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Скарбы з каморкі.
**13.50, 23.50** Склады.
**14.40** Стальныя хлопцы.
**18.00** Дамы на дрэвах.
**18.50** Ванная пад ключ.
**19.40** Бітва за нерухомасць.
**20.30** Мяцежны гараж.
**1.30** Рукамі створаныя цуды.
**2.20** Перш за ўсё — самалёты.
**3.10** Аэрапорт знутры.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?
**7.12** Праз магію да зорак.

## А ВЫ ВЕДАЕЦЕ?

### Псіхалагічныя хітрасці, якія дапамогуць дамагчыся жаданага

**Вы можаце «ўзламаць» не толькі свой мозг, каб, напрыклад, хутчэй запамінаць інфармацыю, але і мозг іншых людзей. Не палохайцеся, калі гэта трохі нагадвае раманы Джорджа Оруэла. Вось дзесяць хітрасцяў для такога «ўзлому».**



***Глядзіце шырэй.*** Людзі, сканцэнтраваныя на чымсьці адным, часта могуць выпускаць з-пад увагі іншую інфармацыю. Выкарыстоўвайце гэтую хітрасць, калі хочаце зрабіць нешта непрыкметна. Напрыклад, вядомая гісторыя пра зладзюжку ў Заходнім Берліне. Кожны дзень ён ездзіў на сваім веласіпедзе на ўсход з торбай, поўнай пяску. Ахоўнікі кожны дзень правяралі яго сумку на кантрабанду, але ніколі нічога не знаходзілі. І яны адпускалі яго. Аднак яны так ніколі і не заўважылі, што ён краў веласіпеды.

***Сачыце за позай.*** Калі вы з кімсьці размаўляеце, паспрабуйце скапіраваць яго ці яе позу. Калі вы зробіце гэта, людзі неўсвядомлена будуць ставіцца да вас добразычліва. Гэта можа вам вельмі дапамагчы, асабліва калі вы нешта просіце.

***Рабіце паўзу.*** Гэта стары трук, але ён вельмі можа спатрэбіцца на перамовах. Калі вы ведзяце з кімсьці перамовы, рабіце доўгія (нават вельмі доўгія) паўзы, перш чым задаць пытанне. Гэта бяспройгрышны спосаб прымусіць людзей казаць праўду.

***Ківайце.*** Калі вашы сябры выступаюць з прэзентацыяй, дапамажыце ім, ківаючы галавой падчас выступлення. Гэта працуе найлепшым чынам, калі рабіць у канцы кожнага сказа. Невядома чаму, але гэта дапамагае не збіцца і не заблытацца пры публічных выступленнях. Працуе ў 9 выпадках з 10.

***Памаўчыце, каб даведацца.*** Размаўляючы з чалавекам і не атрымаўшы поўны адказ на зададзенае вамі пытанне, зрабіце паўзу і ветліва памаўчыце. Затым вы зможаце атрымаць даволі поўны адказ на ваша пытанне. Многіх людзей невытлумачальна палохае, калі іх суразмоўца маўчыць.

***Выкарыстоўвайце розныя варыянты.*** Нам часта даводзіцца выбіраць паміж некалькімі магчымымі варыянтамі. Паспрабуйце выбраць два з іх і прапанаваць у якасці альтэрнатывы чалавеку, якога вы спрабуеце пераканаць. Часцей за ўсё выберуць менавіта адзін з вашых варыянтаў.

***Будзьце сумленным.*** У наступны раз, калі вы зберацеся зрабіць які-небудзь непрыстойны ўчынак (але ў рамках закона, вядома ж), паспрабуйце быць сумленным. Зрабіце выгляд, што вы тут і павінны быць і робіце тое, што вам дазволена. Вы здзівіцеся, як гэта працуе. Але: калі ласка, не выкарыстоўвайце гэта на зло.

***Назавіце па імені.*** Калі вы дасце чалавеку паперу і ручку і папросіце напісаць нешта, хутчэй за ўсё гэта будзе яго ці яе імя. Цікава, ці не праўда?

***Прапануйце адказ.*** У маркетынгу адкрытыя пытанні (а не проста пытанні, якія прадугледжваюць адказы «так» і «не») часта могуць падняць продаж. Напрыклад, параўнайце: «Не хочаце купіць яшчэ дзве ўпакоўкі і атрымаць зніжку?» і «А чаму б вам не ўзяць яшчэ дзве ўпакоўкі, і тады вы атрымаеце зніжку на ўсе?».

■ Вось яно як

# РЭЦЭПТЫ ДАЎГАЛЕЦЦЯ ПА-БРЫТАНСКУ

## АДСУТНАСЦЬ ТЭЛЕВІЗАРА

**Брытанская пенсіянерка Гертруда Хіндлі, якой на мінулым тыдні споўнілася 103 гады, раскрыла сакрэт свайго даўгалецця. Ён заключаецца ў адсутнасці тэлевізара, піша The Daily Mirror.**



«Ва ўсіх маіх сяброў ён ёсць, але я не хачу яго мець. Я проста хачу спакою», — патлумачыла доўгажыхарка, якая да выхаду на пенсію працавала сядзелкай. Хіндлі не бачыла ніводнай тэлетрансляцыі: ні каранацыі каралевы Елізаветы II, ні забойства Джона Кенэдзі, ні высадкі першага чалавека на Месяц, ні падзення Берлінскай сцяны. Тэракт 11 верасня таксама прайшоў міма яе ўвагі.

Замест таго, каб глядзець тэлевізар, Хіндлі, па ўласным прызнанні, даглядала пажылых людзей. Акрамя таго, у 1970-х гадах яна дапамагла стварыць раённы прытулак для жывёл і значную частку часу прысвячала ім, ёй не было калі глядзець перадачы. Гертруда Хіндлі не мае ўласных дзяцей і пражывае ў доме састарэлых. Яе пляменнік Рычард пацвердзіў, што «яна сапраўды ніколі не ведала, што адбываецца ў свеце». «Я думаю, таму яна так доўга і жыве. Яна ніколі не хвалявалася з-за навін», — сказаў ён.

## СОН, ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ І... ВІСКІ

**А вось таксама брытанец (але не карэнны, а індыйскага паходжання) Назар Сінгх, які лічыцца найстарэйшым жыхаром Вялікабрытаніі, таксама нядаўна адзначыў свой дзень нараджэння, які для яго стаў 111-м. Як паведамляе The Daily Mirror, на святкаванні мужчына выпіў куфаль піва і келіх віскі. Сакрэтам свайго даўгалецця Сінгх назваў шмат сну, здаровы лад жыцця і ўжыванне віскі.**



Сын імянінніка Чэйн расказаў, што яго бацька спіць па дзевяць гадзін за суткі, любіць піць малако і міндальны алей, а таксама рэгулярна есць садавіну. У свае 111 гадоў Назар Сінгх ні разу не рабіў аперацый, ён захаваў некалькі ўласных зубоў і мае ідэальны слых. Чэйн Сінгх удакладніў, што яго бацька адзначыў дзень нараджэння ў коле сям'і ў Індыі, куды з'ехаў у пачатку гэтага года.

Назар Сінгх нарадзіўся 8 чэрвеня 1904 года ў невялікай індыйскай вёсцы. З 10-гадовага ўзросту ён дапамагаў сям'і ў полі, а займацца садам і агародам Сінгх закончыў толькі чатыры гады таму. У 1932-м мужчына закончыў традыцыйны для Індыі шлюб па дамоўленасці з дзяўчынай па імені Нарайян Каур з суседняй вёскі, у шлюбе з якой у яго нарадзіліся дзевяць дзяцей. Яго жонка памерла 12 гадоў таму ў 90-гадовым узросце. У Сінгха ёсць 34 унукі і 64 праўнукі. У 1965 годзе мужчына з сям'ёй пераехаў у Англію, дзе амаль 25 гадоў прапрацаваў на ліцейнай вытворчасці.

Званне самай старой жыхаркі планеты цяпер належыць амерыканцы Джэралін Тэлі, якой 23 мая споўнілася 116 гадоў. Жанчына пражывае ў прыгарадзе Дэтройта.

**Іван КУПАРВАС**

# НЯДЗЕЛЯ, 21 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.05** Драма **«Перакладчык». 3-я і 4-я, заключная, серыі.**
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на свята Сабор Беларускіх святых.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.15** Камедыя **«Кухня».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка перадач.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Нашы.
**15.45 Меладрама «Яго каханне». 3-я і 4-я, заключная, серыі.**
**17.25** Драма **«Доктарка». 3-я і 4-я, заключная, серыі.**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15** Дыялогі пра цывілізацыю.
**22.45** Драма **«Шпіталь».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.50** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**8.10, 21.40** Серыял **«Шчаслівыя разам».**
**10.00** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.35, 20.05** Тэлебарометр.
**10.40** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**12.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**13.55 Камедыя «Спадарыня пакаёўка».**
**15.45 Маст. фільм «Царства нябеснае».**
**18.10** «Comedy woman».
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.35** Першыя Еўрапейскія гульні ў Баку-2015.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.05, 15.35, 0.10** Калейдаскоп.
**8.10, 12.15, 15.45, 0.20** «Размовы пра духоўнае».
**8.20 «Імперыя. Пачатак». Драма. Часткі 1-я і 2-я.**
**10.05** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Канстанцін Сцепанец.
**10.45** «Наперад у мінулае».
**11.10, 21.05** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**12.25** «Таямніца душы». Князь Уладзімір. Значэнне асобы ў гісторыі.
**12.50, 22.00 «Пацалунак Сакрата». Серыял. Фільм трэці «Праклён Эдварда Мунка». 1-я і 2-я серыі.**
**14.30** «Музеі Беларусі». Музей народнай архітэктуры і побыту.
**14.55** «Сны Сафіі Снесаравай». Дак. фільм.
**15.55 «Узыходжанне». Драма.**
**17.45** «Васіль Быкаў. Франтавыя старонкі». Дак. фільм.
**18.15, 23.35** «Культпрасвет».
**18.55 «Блаславіце жанчыну». Меладрама.**
**20.45** Калыханка.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 7.45, 1.50** PRO спорт. Навіны.
**7.30, 1.30** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Вынікі дня.
**8.00** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Скачкі на батуце. Фінал. Пляжны валейбол.
**10.05** Сэлфі.
**10.30** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Стральба з пнеўматычнай вінтоўкі. Фінал.
**11.40** Аўтаспорт. Чэмпіянат Усходняй Еўропы па дрыфтынгу.
**12.50** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Мастацкая гімнастыка. Фінал. Акрабатыка. Веласпорт. Стральба з лука.
**15.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Дзень другі. Чэбаксары.
**19.20** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Пляжны валейбол. Фінал.
**20.10** Тэніс. Турнір ВТА. Бірмінгем. Фінал.
**22.15** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Воднае пола. Фінал.
**23.40** Футбол. Чэмпіянат свету. U-20. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Жонкі экстрасэнсаў. Ад світанку да захаду».
**10.35** «Фазэнда».
**11.10** «Достояние Республики»: Ганна Герман».
**13.10 Серыял «Маскоўская сага».**



**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Адгадай мелодыю».
**17.00** Дак. фільм «Артэк». Да 90-годдзя міжнароднага дзіцячага цэнтра.
**18.00** «Кропля ў кроплю». Лепшае.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вызваленая Еўропа».
**22.00** «Што? Дзе? Калі? «.
**23.10** «Містар і місіс СМІ».
**23.45** Дэтэктыў «Тайнае жыццё пчол».

### СТБ

**6.00 Серыял «Студэнты International».**
**7.30** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.50, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.15 Маст. фільм «Практычная магія».**
**10.10** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 Серыял «Салдаты 2».**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 23.50 Маст. фільм «У чэрвені 41-га». Заключныя серыі.**
**15.40** «Дарагая перадача».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Како Шанэль». 2-я серыя.**
**22.15** «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**7.45 Маст. фільм «Залаты гусак».**
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я?».
**10.45 Серыял «Выратаваць мужа».**
**14.10 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**16.15, 22.10 Серыял «Крыху не ў сабе».**
**21.00** «Разам».
**23.15 Маст. фільм «Маналетэ».**
**1.05 Маст. фільм «Сцяна».**
**4.15 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Мой блізкі вораг».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** М/ф.
**14.15** «Расія. Геній месца».
**15.05 Маст. фільм «Мой тата — ідэаліст».**
**16.40** «Смяюцца дазваляецца».
**18.10** «Жывы гук».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.50 Маст. фільм «Берагі кахання».**
**23.40** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10, 8.20** Серыял «ППС».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.55** «Медыцынскія тайны».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Я худзею».
**14.15 Серыял «Каця».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**20.00 Баявік «У чэрвені 41-га...».**
**23.50** «Спіс Норкіна».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.05, 18.55, 21.05, 23.30** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.35, 13.20, 17.00, 21.00** «Хатняя крама».
**10.50, 23.30** «Хобі TV».
**11.40, 13.30, 15.10 Серыял «Бангкок-Хілтан», 1—6 серыі.**
**16.45** «Кінаблакнот».
**17.30 Серыял «Каломба».**
**19.00 Меладрама «Жалезная лэдзі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Прыгоды «Маска Зора».**



### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 15.30** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сямейны бізнес».
**13.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.30** «Рублёва—Бірулёва».
**16.00, 1.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**16.30** Баявік «Мушкецёры ў 3D».
**18.40, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.30** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**21.30** Скетчком «Студэнты».
**22.00** Фэнтэзі «Іншы свет 2: Эвалюцыя».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**5.00** Серыял «Калыска над безданню».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Вертыкаль». Маст. фільм.
**11.50** «Легенды сусветнага кіно». Дуглас Фэрбенкс.
**12.20** «Якія размаўляюць з бялухамі». Дак. фільм.
**13.30** «Літаратурны музей: успамін аб будучыні». Дак. фільм.
**14.15** «Пешшу...» Масква архітэктара Жалтоўскага.
**14.45** Зоркі сусветнай опернай сцэны. Чэчыля Барталі.
**15.50, 23.45** «У чацвер і больш ніколі». Маст. фільм.
**17.15** «Астравы». Любоў Дабржанская.
**18.00** «Кантэкст».
**18.40, 1.55** «Шукальнікі». «Містыфікацыі супрэматычнага караля».
**19.30** Да юбілею Святланы Кручковай. «Жаніцьба». Маст. фільм.
**21.05** У гасцях у Эльдара Разанава. Вечар Святланы Кручковай.
**22.05** «Элегія жыцця. Растраповіч. Вішнеўская». Дак. фільм.
**1.15** «Больш, чым каханне». Алег і Ліза Даль.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. Паўтор ад 2009 года.
**6.45, 8.25, 9.40, 11.00, 12.45, 14.00, 17.35, 18.35, 19.55, 20.45, 23.05, 0.05, 2.00, 3.40, 5.00** Музычная Настальгія.
**7.05** Маст. фільм «Дзень анёла».
**8.35** М/ф «Хто атрымае ананас?».
**8.45** М/ф «Някемлівы верабей».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**11.40** Фільм-канцэрт «БГ». (Барыс Грабеншчыкоў)». 1991 год.
**13.05** «Адліга». Канцэрт групы «ДДТ». 1988 год.
**14.45** М/ф «Непаседа, Мякіш і Нетак».
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Квартэт Гварнеры».
**18.00** «Акулы пяра». Маша Распуціна. 1995 год.
**19.00** «Рабіна на каньяку». Канцэрт Гарыка Сукачова, прысвечанага яго 30-годдзю ў тэатры-студыі А. Табакова. 1989 год.
**20.30** М/с «Прыгоды Рэкса».
**22.00** Маст. фільм «Формула вясёлкі».
**0.00** «Прэс-экспрэс».1995 год.
**1.00** Маст. фільм «Дзівак-чалавек».
**2.35** М/ф «Нямыйка».
**2.45** М/ф «Асцярожна — нервы!».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».
**5.20** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаўм. Твар у твар».

### EUROSPORT

**4.00, 19.45, 22.45, 1.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. 1/8 фіналу.
**9.30** WATTS.
**9.45** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**10.00** Гран-пры 3. Серыя.
**11.00** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.
**11.30, 1.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**12.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**13.15** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**15.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**19.30** Аўта- і мотаспорт.
**22.00** Футбол.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Увесь я».
**8.25** Прыгоды «Цудоўная чацвёрка».
**10.45** Камедыя «Заказаць у нявесту брата».
**12.30** Камедыя «Нацыянальны гольф і малакасосы».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 19.55, 22.50, 0.40, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Кактус».
**18.20** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**20.20** Камедыя «Гамбіт».
**23.10** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**1.15** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**3.10** Серыял «Я і місіс Джонс».
**4.10** Камедыя «Муж двух жонак».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.55** «Нераскрытыя тайны».
**10.50** «Паненка і кулінар».
**11.20, 1.15** Серыял «Каменская».
**15.15** «Сто пытанняў даросламу».
**16.05** «Жонка. Гісторыя кахання».
**17.25** «Без падману».
**18.15, 4.40** Дак. фільм «Фарцоўшчыкі — небяспечная справа».
**19.50** «Доказ віны».
**20.20** Маст. фільм «Законапаслухмяны грамадзянін».
**22.20** «Асцярожна, махляры!».
**22.50** «Часова даступны».
**23.45** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.30** Камедыя «Флінтстоўны».
**8.05** Драма «Вялікія надзеі».
**10.10** Камедыя «Мадлен».
**11.40, 18.25** Драма «Джулі і Джулія: Гатуем шчасце па рэцэпце».
**13.40** Драма «Знаёмцеся, Джо Блэк».
**16.35** Меладрама «Да цуду».
**20.25** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**22.20** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».
**0.00** Драма «Тайная цяга».
**2.00** Камедыя «Берні».
**3.50** Драма «Мацярык».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Барані мяне, мой талісман».
**7.50** Камедыя «Кіндэр-Вілейскі прывід».
**9.40** Баявік «Сіндром шахматыста».
**13.00** Меладрама «Начныя забавы».
**14.50** Драма «Гідраўліка».
**16.40** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**18.20** Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
**20.20** Баявік «Дзень Д».
**21.50** Драма «Дубровскі».
**0.10** Камедыя «Карпаратыў».
**2.25** Камедыя «Двайная згуба».
**4.35** Камедыя «Сябры сяброў».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30** Займальная навука.
**7.55** Код небяспекі.
**8.40** Космас: Прастора і час.
**9.25** Навука будучыні.
**10.10** Папулярная навука.
**10.55, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**12.30** Больш чым фокусы.
**13.15** Гісторыя ежы.
**14.00** Дзённік Ганны Франк.
**14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.20** Дзікая прырода Расіі.
**17.10** Дзясятка лепшых фота «Nat Geo» 3.
**17.55** У пошуках Атлантыды.
**18.40, 23.15, 2.15** Асушыць акіян.
**19.30** Saxon Gold: New Secrets Revealed.
**20.15** Пячора гіганцкіх крышталёў.
**21.00, 0.00** Землятрус на Эверэсце.
**21.45, 0.45** Найгоршае надвор'е ўсіх часоў?
**22.30, 1.30, 3.00** Карставыя варонкі.
**3.45** Больш, чым тыраназаўр.
**4.30** Праект: Дыназаўр.

### DISCOVERY

**8.00** Скарбы з каморкі.
**8.50, 13.50, 2.20** Стальныя хлопцы.
**9.40** Склады.
**10.30** Рукамі створаныя цуды.
**11.20** Аэрапорт знутры.
**12.10, 3.10** Аляска: сям'я з лесу.
**13.00** Выжыць разам.
**14.40** Ванная пад ключ.
**15.30, 22.10, 1.30** Хуткія і гучныя.
**16.20, 23.00** Горш не бывае.
**17.10, 23.50** Праз магію да зорак.
**18.00, 5.36** Аэрапорт знутры.
**20.30** Залатая ліхаманка.
**0.40** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**4.00** Аляска: апошняя мяжа.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?

■ Падпіска-2015

# БАРБЕКЮ АД ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТЫ

**Суперпрыз рэкламнай гульні «Адпачнём на прыродзе са «Звяздою», які мы разыгралі падчас мінулай падпісной кампаніі, знайшоў свайго ўладальніка! Жыхар Кобрына Аляксей Васільевіч ШЧЭРБА ўчора завітаў да нас у рэдакцыю, каб забраць свой падарунак — барбекю Sundays. «Такога прыстасавання ў мяне дома няма, — прызнаецца наш пераможца. — Самаробным барбекю звычайна карысталіся. Але гэта (чытач паказвае на прыз) — іншая справа!»**




Аляксей Васільевіч раней працаваў на чыгунцы: 38 гадоў быў машыністам крана. Цяпер мужчына на пенсіі. Але бадзёрасці і моцы «звяздоўскага» падпісчыка можна толькі пазайздросціць. Цяжкі падарунак («Нічога сабе! Барбекю там адразу з куранятамі, ці што?» — здзівіўся наш фатограф, паспрабаваўшы падняць каробку.) Аляксей Васільевіч з лёгкасцю ўхапіў адной рукой. «У мяне свой дом у Кобрыне, у агародзе барбекю пастаўлю, — дзеліцца планамі мужчына. — Зяць у нядзелю ўжо прыедзе, паспрабуем прыгатаваць штосьці-небудзь. Ён гэтую справу любіць. Калі дзень народзінаў адзначаем ці якое іншае свята, заўсёды шашлыкі смажыць».

Сям'я ў Аляксея Васільевіча немаленькая: жонка, дзве дачкі, зяць, два ўнукі (старэйшы вучыцца ў брэсцкім тэхнікуме). «Чым на пенсіі займаюся? — усміхаецца мужчына. — Уласную гаспадарку маленькую трымаем — некалькі курэй і ўсё. У лес па грыбы, калі сезон, езджу». Адпачыць на рэчку Мухавец, якая працякае ў Кобрыне, пенсіянер з сям'ёй выбіраецца нячаста. Жартуе, што жонка ездзіць да вады не вельмі любіць, бо плаваць не ўмее.

Аляксей Васільевіч цікавіцца жыццём свайго рэгіёна і краіны, таму праглядае шмат газет. Некалі пры Савецкім Саюзе выпісваў «Известия», цяпер чытае раённую і абласную прэсу. «Звязду» мужчына выпісвае больш за 20 гадоў. «Усё цікава, — кажа ён. — І пра надвор'е на заўтра даведацца можна, і пра знакамітых землякоў. Чытаю ад першай да апошняй старонкі».

Зычым Аляксею Васільевічу і яго сям'і цёплых дзянькоў і смачных шашлыкоў на новым барбекю!

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

# У ЛІПЕНІ ПРЫПЯЧЭ НАПОЎНІЦУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Значэнні ўзроўняў вады ў цяпер знаходзяцца ніжэй за шматгадовыя мінімумы для гэтай пары года на Дняпры каля Жлобіна, на Бярэзіне ў Бабруйску, на Сожы Крычава і Гомеля, яго прытоку рацэ Бесядзь у вёсцы Свяцілавічы і прытоку Прыпяці рацэ Случ каля вёскі Ленін. Найбольш неспрыяльныя ўмовы для работы рачнога транспарту назіраюцца на Заходняй Дзвіне каля Віцебска, Дняпры на ўчастку Магілёў — Рэчыца, на Бярэзіне ў Барысаве і ў Светлагорску, Сожы каля Гомеля і Піне ў Пінску.

Спецыяліст адзначыў, што ў найбліжэйшыя дні на рэках захавацца спад узроўняў вады, у выніку чаго пагоршацца ўмовы для работы рачнога транспарту на Заходняй Дзвіне каля Суража і ў Полацку, Прыпяці каля Мазыра.

## ПЕРШЫЯ ПРЫКМЕТЫ ЗАСУХІ

Такі актыўны і сухі пачатак лета адмоўна адбіўся не толькі на рэках. Сітуацыя ў аграрным сектары яшчэ больш складаная. Дзмітрый Рабаў адзначыў тут даволі сумную карціну. Так, на большай частцы Гомельскай вобласці, у некалькіх раёнах Магілёўшчыны і на ўсходзе Мінскай вобласці ў другой палове мая і ў першай дэкадзе чэрвеня недахоп ападкаў склаў ад 60% да 90%. Такі дэфіцыт прывёў да ўзнікнення глебавай засухі. Больш за тое, глебавая засуха цяпер назіраецца на фоне зніжэння вільготнасці паветра да 15-30%. Найбольш складаная сітуацыя для аграрыяў існуе сёння ў Гомельскай вобласці і месцамі на ўсходзе Мінскай. Сіноптыкі амаль упэўнены, што далейшая спякота без ападкаў становішча ў аграрным сектары толькі пагоршыць. А ўраджай збожжавых на плошчах з лёгкай глебай такое выпрабаванне можа і не перажыць...

## НА ВЫХАДНЫЯ ПЕРАСКОЧЫЦЬ ЗА ПЛЮС 30

Ужо ў пятніцу да нас завітае больш цёплае паветра з поўдня Еўропы. Будзе пераважна без ападкаў і выключна сонечна. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 21-27 градусаў, а на поўдні краіны павялічыцца да 29 цяпла. Практычна не будзе ападкаў і ў суботу, толькі ўдзень па паўночна-заходняй палове краіны магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе 12-19 цяпла, а максімальная ўдзень будзе дасягаць ужо 27-34 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, кардынальная змена надвор'я пачнецца толькі ў панядзелак. Тады ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Удзень у асобных раёнах чакаюцца моцныя дажджы, а пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с, магчымы град. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 12-19 цяпла, аднак максімальная ўдзень будзе дасягаць яшчэ плюс 27-34 градусаў. Толькі па паўночным захадзе тэмпература знізіцца да плюс 21-26 градусаў. Сапраўды стане свяжэй менавіта ў аўторак, калі амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы, моцныя дажджы і ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Уначы адразу стане халадней — толькі 9-15 цяпла, а максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе толькі плюс 16-22 градусы. Аднак на паўднёвым усходзе нават уначы будзе 16-19 цяпла, а ўдзень — плюс 23-28 градусаў.

## СПЯКОТУ ЧАКАЮЦЬ БЕЗ РЭКОРДАЎ

Вядома, што ў сезон адпачынкаў ад Дзмітрыя Рабава мы чакалі доўгатэрміновых прагнозаў. Па чэрвені гэты месячны прагноз на здзіўленне ўвогуле не прадугледжвае нейкіх істотных тэмпературных сюрпрызаў. Нягледзячы на анамальна сухі і цёплы старт, сярэдняя месячная тэмпература чэрвеня чакаецца ў межах нормы. Праўда, на поўдні краіны будзе крыху цяплей за кліматычную норму апошніх гадоў. Прагназуецца звычайным чэрвень і па колькасці ападкаў. Спецыяліст адзначыў, што пасля сухой першай дэкады далей ападкі свае возьмуць. Сур'ёзныя дажджы чакаюцца ў пачатку наступнага тыдня. Потым у чацвер і пятніцу — зноў сонечна і суха. На выхадных праз тыдзень прагназуюцца чарговыя непрацяглыя дажджы. Будзе няўстойлівы і таму звычайны чэрвень для Беларусі. Увогуле, спецыялісты падлічылі, што другая і трэцяя дэкады чэрвеня пройдуць у нас пад знакам дажджлівага і адначасова камфортнага цёплага надвор'я.




По пажарнай небяспецы наша краіна ад зялёнага колеру актыўна рухаецца ў чырвоны.

## ЗАЛІЕ І ЗАСМАЖЫЦЬ

Сёлета ліпень будзе недзе на 1-2 градусы цяплейшы за чэрвень. А істотнае павелічэнне тэмпературы паветра будзе назірацца ў перыяд ад першай да трэцяй дэкады месяца.

Менавіта другі месяц лета ў Беларусі лічыцца самым гарачым. Акрамя таго, гэтым летам сярэдняя месячная тэмпература паветра будзе на 0,5 градуса вышэй за кліматычную норму (плюс 17-19 градусаў). Ападкі плануюцца ў межах нормы (74-97 мм), а па паўночным захадзе дажджы будуць актыўнічаць нават крыху мацней, чым у мінулыя гады. Увогуле, ліпень у нас адначасова і самы дажджлівы, і самы спякотны. За месяц тут бывае ад 12 да 16 дзён з дажджом. Сёлета сіноптыкі пужаюць нас сапраўды моцнымі ліўнямі ў гэты месяц, а таксама даволі шквалістым ветрам і сур'ёзнымі навальніцамі. Сярэдняя дзённая тэмпература ліпеня чакаецца ад 22 да 25 цяпла, аднак у асобных месцах будзе прыпякаць і да плюс 30-36 градусаў. Уначы будзе плюс 12-14 градусаў.

## НЕ ЗАМЕРЗНЕМ І Ў ЖНІЎНІ

Каб дакладна ведаць, калі будзе самае цудоўнае надвор'е, трэба спытаць у сіноптыка пра яго адпачынак. Дзмітрыя Рабава на працы не будзе ў ліпені. Але спецыяліст запэўніў, што і апошні месяц лета яшчэ парадуе нас цёплымі, а часам і гарачымі днямі. А доўгатэрміновы прагноз абяцае, што гэты жнівень будзе цяплейшы за мінулыя. Сярэдняя месячная тэмпература яго чакаецца вышэй за шматгадовыя паказчыкі на 0,5 градуса пры норме плюс 16-17 градусаў.

Амаль паўсюдна будзе ў больш ападкаў, за выключэннем поўначы краіны, дзе дажджоў будзе менш (кліматычная норма 62-89 мм). Ужо з першай дэкады жніўня тэмпература паветра пачынае зніжацца. Звычайна другая дэкада месяца на 0,8 градуса халаднейшая за першую. А ў трэцяй дэкадзе адпачываюць у нас увогуле толькі аматары хатніх нарыхтовак. Тут сярэдняя тэмпература паветра складзе сёлета каля 15,4 цяпла, што ўжо на 1,4 градуса ніжэй, чым у другой дэкадзе. Аднак бываюць і выключэнні. Напрыклад, самы цёплы жнівень быў зафіксаваны ў 2010 годзе, калі сярэднямесячная тэмпература паветра па Беларусі склала плюс 20,8 градуса, што на 4,3 градуса вышэй за кліматычную норму. Між іншым, у той год і ўсё лета было сапраўды анамальна гарачым.

Аб прагнозе на ўсё лета Дзмітрый Рабаў выказаўся даволі акуратна. Яно чакаецца крышку цяплейшым за звычайнае беларускае лета. Нейкай сапраўды працяглай гарачыні ці моцнай засухі сіноптык у сваіх картах не бачыць. Але і запланаваную спякоту недзе ў ліпені ці жніўні яшчэ ніхто не адмяняў. Сёлета чакаецца некалькі хваль трапічнай гарачыні працягласцю не больш за адзін тыдзень.

**І яшчэ. Дзмітрый Рабаў лічыць, што цудоўна адпачываць гэтым летам можна і ў Беларусі. Тым больш што замежнай валюты такі адпачынак не патрабуе, а тэмпература вады ў рэках і вадаёмах знаходзіцца ў межах ад 16 да 23 цяпла. А праз тыдзень вада стане і ўсе плюс 25.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# Правы спажыўцоў



## Пра сямейныя адносіны, танны спірт і мазгі, якія лепш трымаць уключанымі

**С**А стрыечнай сястрой Наташай мы падобныя, як родныя (дзедава кроў), але бачымся вельмі рэдка. Лёс у свой час занёс мамінага брата з-пад Станькава ў далёкі Днепрапятроўск, там ён і атабарыўся, ажаніўся, нарадзіў і выгадаваў дачок і ўнукаў, там і знайшоў апошні прытулак на стромкім беразе вялікай ракі. Дочкі далёка ад дому не паехалі: адна засталася ў родным горадзе, а Наталля жыве ў недалёкім Краменчугу. Калі пачаліся вядомыя падзеі ва Украіне, мы з хваляваннем лавілі кожную навіну: усё ж родныя людзі там. Яны нас спачатку па тэлефоне супакойвалі: маўляў, нічога страшнага. Пасля ў голасе Наталлі загучала трывога: і сын прызыўнога ўзросту, і Данецк не вельмі далёка, дый самі яны рускамоўныя, як і большасць тамтэйшых жыхароў. Памятаю, летась на дзень Перамогі яна прыслала мне такое SMS-паведамленне: «Родныя! Віншуем вас са святам! зычым вам дабра і МІРУ!». У кантэксце тых падзей, якія год назад пачыналі ў іх раскручвацца, бы страшны Малох, без слёз на вачах гэта пажаданне чытаць было немагчыма.

Пасля здавалася, што яны проста прывыклі. Сазваньваючыся, мы гаварылі больш пра сямейныя навіны, не лезлі асабліва ў палітыку. Часам у яе праскоквала шкадаванне, што бацька ў свой час не вярнуўся ў Беларусь, не перавёз сюды сям'ю, бо ў нашу краіну яна проста закахана і ведае, што яе радзіма менавіта тут.

**І**ўсё было цёпла, па-сямейнаму спагадліва да сёлетняга 9 мая. Гэтым разам віншаванне паслала ўжо я. Прыкладна тое ж самага зместу, з пажаданнем дабра і міру. Наташа пазваніла мне хвілін праз пяць. «Ну, і цябе са святам. Праўда, ты ж разумееш, гэта свята цяпер мае розныя сэнсы...» І ў голасе столькі... ці то іроніі, ці то гонару ад ведання нейкай не ўсім даступнай ісціны, якая для яе раптам дзівосным чынам адкрылася. Неяк пераадолеўшы сапраўдны шок (праўда-праўда, мне на нейкі момант аж дух заняло), я адказала ёй спакойна і ўпэўнена, што Перамога для мяне асабіста і для маёй краіны ва ўсе часы будзе мець толькі адзін сэнс і што развіваць з ёй гэту тэму я не збіраюся (карцела, праўда, але ж тады мы б дакладна пасварыліся). Размова наша далей не клеілася, задалі дзяжурныя пытанні пра сямейнікаў і даволі стрымана развіталіся. Прайшоў ужо больш за месяц, а мы так ні разу і не сазваніліся, нават у інтэрнэце, хоць я пастаянна бачу, што яна «ў сеціве». Знікла, і баюся, ці не надоўга, калі не назаўсёды, тая наўлоўная цеплыня, што саграваць нас нават праз тысячы кіламетраў.

Вось так адносіны адной асобна ўзятай сям'і сталі ахвярай, не пабаюся гэтага слова, інфармацыйнай вайны. Зразумела, прапаганда — вялікая сіла, але як магла на яе «павесціся» 45-гадовая жанчына з вышэйшай адукацыяй, у якой дзед (наш агульны, на якога мы з ёй так падобныя) прайшоў ад Сталінграда да Берліна, бацьку якой разам з сястрой і бабуляй толькі цудам не расстралялі фашысты як сям'ю камандзіра Чырвонай Арміі? Вось што не дае спакою найбольш. Я, пэўна, не тэлефаную ёй, бо спадзяюся, што яна ўсё зразумее сама. На нешта ж даў нам Божачка розум і ўменне думаць...

**Н**а Беларускім міжнародным медыяфоруме, які праходзіў на гэтым тыдні ў Мінску, шмат і па справе калегі з дзвюццаці краін гаварылі пра тыя ж інфармацыйныя войны, пра сумленне і адказнасць журналістыкі і журналістаў, якія даносяць інфармацыю. Але варта, прычым не толькі ў межах нейкага мерапрыемства, усім нам задумацца пра нас саміх — спажыўцоў гэтай інфармацыі. Вырашыць для саміх сябе, хто мы — «піпл», які «хавае» і нават не спрабуе пераварыць усё, што дадуць, ці нармальныя адукаваныя людзі, якія ўмеюць думаць і ацэньваць, якія не рынуцца кудысьці бязмозглым натоўпам таптаць каштоўнасці ці іншых людзей з-за раскручанай у сеціве «сенсацыі». І гэта не проста пытанне ўласнай свядомасці і таго ж сумлення. Размова ідзе, калі хочаце, аб выхаванні нацыі, аб нашым месцы на гэтай зямлі. І гэта таксама трэба ведаць, разумець і асэнсоўваць.

**...М**ногія жыхары невялікага райцэнтра на Міншчыне дагэтуль успамінаюць адну трагікамічную гісторыю. На пачатку 90-х, у часы суцэльнага дэфіцыту, па раённым радыё прагучала абвестка: маўляў, на чыгуначную станцыю прыбыла цыстэрна з харчовым спіртам. Нешта там сапсавалася ў колах, везці яе далей не могуць, таму гаручы напой будуць прадаваць ледзь не задарма проста на станцыі ўсім, хто захоча, але толькі ў тару пакупнікоў. Праз нейкі час на станцыю пацягнуліся ахвочыя да таннага спірту. Прычым не толькі мужыкі-выпівохі, але і старыя бабулі, і малыя дзеці. Хто з бітончыкам, хто са слоікам, хто з вядром, нехта нават умудрыўся прыладзіць на саначкі (снег яшчэ ляжаў) трыццацілітровы бітон... Рагочучы, за імі назіралі тыя, хто застаўся дома, бо дадумаўся калі не глянуць на каляндар (было, як вы разумееце, 1 красавіка), дык хаця б элементарна ўключыць мазгі.

Чаму гісторыя «трагікамічная»? Бо са смехам згадваюць яе толькі тыя, хто назіраў. Тыя, хто соваўся ў непагадзь праз увесь горад на станцыю, а пасля ні з чым дадому, калі загаворваеш з імі пра тое нават сёння, праз амаль трыццаць гадоў, толькі з прыкрасцю адмахваюцца.

Іх можна зразумець. І брыдка, і сорамна, і ўжо нічога не перайначыш.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах дер. Лужки, дер. Сосновая, дер. Новое Житьё Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 13 июля 2015 года в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,0868 га, № 624883005601000154, дер. Лужки (по генплану № 1)<br>Лот № 2 – площадь 0,0865 га, № 624883005601000155, дер. Лужки (по генплану № 2)<br>Лот № 3 – площадь 0,1019 га, № 624883010101000319, дер. Сосновая (по генплану № 82)<br>Лот № 4 – площадь 0,1500 га, № 624883007601000052, дер. Новое Житьё |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 100 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 100 000 000 рублей<br>Лот № 3 – 250 000 000 рублей<br>Лот № 4 – 80 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Лужки – подъездная дорога, электричество, газ; дер. Сосновая – подъездная дорога, электричество, газ; дер. Новое Житьё – нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 7 июля 2015 года в 17.00 |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).
3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

Печать и свидетельство о государственной регистрации ООО «МГ Моторы» (УНП 101288743) **считать недействительными в связи с утерей.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника»

| | | | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Нежилое помещение с инв. 330/D-182 | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Интернациональная, д. 109 | 53 760 | 2 688 | 5 |

Назначение – помещение неустановленного назначения. Г.п. – 1968 г. Общая площадь – 65 кв.м. Этажей – 1 шт. Фундамент – бетонный. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия междуэтажные – ж/б плиты. Полы – линолеум. Проемы оконные и дверные – деревянные. Центральное отопление – водяное. Электроосвещение – скрытая проводка. Телефон – каблирован. Вентиляция – естественная.

| | | | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №2** | Здание нежилое с инв. №710/С-10624 | Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 54 | 111 120 | 5 556 | 5 |

Назначение – здание нежилое, одноэтажное, кирпичное с одной пристройкой. Г.п. – 1946. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 326 кв.м/231,8 кв.м. Фундамент – бутовый. Стены – кирпичные. Перегородки – дощатые, гипсокартон. Перекрытия чердачные – деревянные, оштукатурены, побелены. Крыша – из асбестоцементных волнистых листов, жестяная. Полы – дощатые, окрашены, плиточные, ДВП, линолеум, ламинированные. Проемы оконные – деревянные двойные, окрашены, ПВХ. Проемы дверные – филенчатые, щитовые, окрашены, МДФ. Наружная отделка – окрашено. Внутренняя отделка – оштукатурено, облицовано, окрашено, оклеено обоями, обшито гипсокартоном. Центральное отопление – стальные трубы, отопительные приборы, открытые, окрашенные. Водопровод – металлические трубы. Электроосвещение – скрытая проводка. Радио – трансляционная сеть. Телефон – каблирован. Горячее водоснабжение – водогрейная колонка. Вентиляция – естественная. Канализация – чугунные трубы.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,0997 га с кадастровым номером 741000000006000013. Право постоянного пользования. Целевое назначение – размещение административных зданий. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

| | | | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №3** | Доля 67/500 РУП «Жилкоммунтехника» в административном здании с инв. №700/С-4639 | Могилевская обл., г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 | 100 860 | 5 043 | 5 |

Описание административного здания с инв. №700/С-4639: Назначение – административное здание. Площадь застройки/общая – 300 кв.м/925 кв.м. Г.п. – 1996. Этажей – 4.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,0447 га с кадастровым номером 740100000003000458. Целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административного здания. Право аренды земельного участка. Срок действия по 04.09.2021. Доля Научно-производственного республиканского унитарного предприятия «Жилкоммунтехника» – 67/500. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

